# КАНСТРУКЦЫЯ «2AN» У ТАПОНІМАХ БЕЛАРУСІ

**А. І. Копач**

*Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт,*
*Мінск, Беларусь, aleh@bk.ru*

На прыкладзе тапонімаў, якія наміріуюць геаграфічныя аб’екты Беларусі праз спасылку на другасны атрыбут, паказаны вузкатэрытарыяльны характар такога кшталту рэферэнцыі і разнастайнасць сродкаў у топасістэме для яе ажыццяўлення. Разам з тым адзначана непрадуктыўнасць такіх імёнаў і абмежаванасць відаў аб’ектаў, да якіх яна можа прымяняцца.

***Ключавыя словы:*** тапанімічная канструкцыя; схема; топасістэма; айконім; гідронім; мікратапонім; другасны атрыбут.

# «2AN» CONSTRUCTION IN PLACE NAMES OF BELARUS

**A. I. Kopach**

*Minsk State Linguistic University,*
*Minsk, Belarus, aleh@bk.ru*

A narrowly-drawn kind of reference with a variety of means for its implementation in the toposystem are shown on the names for geographical objects of Belarus which refer to objects by means of secondary attributes. At the same time, the unproductiveness of such names and the limited types of objects to which it is applicable are noted.

***Keywords:*** toponymic construction; scheme; toposystem; oikonym; hydronym; microtoponym; secondary attribute.

Разгляд семантыкі цэласных тапазнакаў магчымы ў рамках граматыкі канструкцый – аднаго з напрамкаў кагнітыўнай лінгвістыкі, што разглядае аб’екты даследавання як сукупнасць схематычных і самастойных канструкцый, запас якіх паэтапна пашыраецца за кошт катэгарызацыі, аналогіі, аўтаматызацыі граматычных структур [1].

У дадзенай працы мы засяродзімся на апісанні схем, якія рэалізуюць тапанімічную канструкцыю «2AN», што сімвалізуе зварот суб’екта да другасных індывідуальных характарыстык топааб’ектаў, неабходны ў сітуацыі, калі першасны атрыбут не вылучае аб’екта з шэрагу аднародных аб’ектаў тэрыторыі.

Матэрыялам для артыкула паслужылі 174 імёны розных відаў топааб’ектаў Беларусі (айконімы, гідронімы, мікратапонімы), пабудаваныя паводле гэтай канструкцыі. У працы выкарыстоўвалася інфармацыя аб тапонімах шасці гісторыка-этнаграфічных зон Беларусі, кожная з якіх прадстаўлена двума раёнамі: Паазер’е (Докшыцкі і Шумілінскі раёны), Панямонне (Гродзенскі і Мастоўскі), Заходняе

Палессе (Брэсцкі і Іванаўскі), Усходняе Палессе (Калінкавіцкі і Мазырскі), Падняпроўе (Быхаўскі і Рагачоўскі), Цэнтральная Беларусь (Пухавіцкі і Чэрвеньскі раёны). Агульная колькасць базы даных імёнаў нашага даследавання – 4707.

Калі для канструкцыі «1AN» кагнітыўнай базай служылі імёны, якія маглі ўспрымацца адначасова як агульныя ці ўласныя (адпавядаюць геаграфічным тэрмінам), то «2AN» будуецца праз суданесенасць з аб’ектамі тапанімічнай прасторы.

Паказчык «2AN» у формуле азначае высвечванне асаблівасці аб’екта, на якім засяроджана ўвага суб’екта, на фоне іншага топааб’екта, што знаходзіцца з назіраным у непасрэднай блізкасці і ўспрымаецца як частка калісьці цэлага аб’екта ці аб’екта з тоеснай назвай. У такой сітуацыі ўзнікае неабходнасць змясціць зону ўвагі суб’екта такім чынам, каб яна адлюстроўвала аб’екты аднаго класа. Фактычна гаворка ідзе пра ўнутрыпадсістэмную індывідуалізацыю. Такія выпадкі звычайна звязаны са звужэннем гарызонту погляду чалавека да двух (зрэдку болей) аб’ектаў у полі яго ўвагі: бел. Бру́скае > *Бру́скае 2*, Ка́менка > *Гарэ́лая Ка́менка*, Мало́е > *Мало́е Ні́жняе*. Падобныя ўзаемаадносіны ў межах невялікіх груп назваў могуць быць разгледжаны як рэферэнтна звязаны тып абагульнення тапонімаў.

Намінатыўны працэс у такіх імёнах ажыццяўляецца з дапамогай другаснага атрыбута, які размяжоўвае бліжэйшыя аб’екты з аднолькавым іменем і спрыяе аднаўленню страчанай функцыі рэгуляцыі арыентацыйных дзеянняў суб’екта. Звычайна ў беларускіх імёнах гэты новы дыферэнцыятар тапоніма займае месца перад базіснай адзінкай: нас. п. *Ні́жнія Пагара́ны* < Пагара́ны. Аднак яго месцазнаходжанне можа быць іншым: нас. п. *Ру́дня Антóнаўская* < Ру́дня.

Пры кагнітыўным аналізе такіх імёнаў увага даследчыка павінна ў роўнай ступені быць прыкавана як да кагнітыўнай базы, так і да профілю. У адрозненне ад тыповага для бессуб’ектнай тапанімікі выяўлення матыватара імені і аўтаматычнага аднясення яго да ліку аданамастычных утварэнняў, выяўленне асаблівасцей намінацыі з пазіцый суб’екта-дзеяча заснавана не на імені, ад якога яно паходзіць, а на імені, да якога яно імкнецца. Калі ў назве в. *Саладу́хі* ролю дыферэнцыятара адыгрывае прозвішча заснавальніка вёскі, то ў айконіме *Саладу́хі Пушчавы́я* такую ролю выконвае прыкмета размешчанасці недалёка ад пушчы, але размешчанасці адноснай, існуючай толькі ў звязцы з яшчэ адным аб’ектам (в. *Саладу́хі*). Іншымі словамі, адрозненне назваў, утвораных з дапамогай гэтай канструкцыі, ад групы, якая фіксуе сваё адноснае размяшчэнне кропкавай спасылкай на іншы аб’ект, заключаецца ў тым, што ў ёй адлюстроўваецца «неаднабаковая семантыка»: Саладу́хі ‘паселішча,

заснаванае Саладухам’; пар. Саладу́хі Пушчавы́я ‘паселішча, якое знаходзіцца каля в. Саладухі і адрозніваецца ад яго размешчанасцю каля пушчы’.

У табліцы 1 прапанаваны статыстычныя паказчыкі і прыклады розных відаў тапанімічных аб’ектаў Беларусі, у якіх сустракаюцца канструкцыі «2AN». Яны рэпрэзентуюць зварот суб’екта да дадатковых паказчыкаў індывідуальнасці аб’екта ва ўмовах павелічэння маштабу і, адпаведна, змяншэння панарамнасці погляду на акаляючую тэрыторыю да некалькіх аб’ектаў аднаго віду з агульнай гісторыяй і/або назвай.

*Табліца 1*

**Прадстаўленасць канструкцыі «2AN» у розных відах аб’ектаў**

| Аб’ект свету | Колькасць, адз. | Доля,% | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Населены пункт і яго часткі | 141 з 2475 | | В. *Падле́ссе Камяне́цкае < в. Падле́ссе, в. Но́выя Навасёлкі < в. Навасёлкі, в. Плі́гаўкі 1 < в. Плі́гаўкі* |
| Вадаём са стаячай вадой і яго часткі | 29 з 1074 | | Воз. *Вялі́кае Кама́рына < воз. Кама́рына, б. Жук 1 < б. Жук, б. Но́вы На́хаў < б. На́хаў* |
| Вадаём з цякучай вадой і яго часткі | 4 з 215 | | Р. *Ваўмя́нка Новая < р. Ваўмя́нка р. Ве́рхняя Зако́ванка < р. Зако́ванка* |

Табліца 1 канстатуе немагчымасць ужывання канструкцыі ў мікратапаніміі. Пашырэнне сінтаксічнай структуры тапоніма адбываецца толькі для сярэдніх па велічыні населеных пунктаў і гідрааб’ектаў. Сярод апошніх такія формы абмяжоўваюцца суаднесенасцю з прытокамі рэк 1–3-га парадку даўжынёй ад 7,9 да 35 км і балотамі. Адзіная назва возера, якая адпавядае канструкцыі «2AN», суадносіцца з аб’ектам плошчай 0,28 км$^2$ і арыентуе адносна мікрааб’екта: воз. *Вялі́кае Кама́рына* < воз. Кама́рына.

Сродкамі, якія дазваляюць імёнам такога тыпу выконваць функцыю арыентацыі, будуць другасныя атрыбуты, дапасаваныя да імёнаў з першасным атрыбутам, і лічэбнікі. Розныя тыпы дадатковых прыкмет пакладзены ў аснову трох схем у межах канструкцыі.

**Схема «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз рэляцыйнасць»**. Яна адзін раз прадстаўлена ў назвах рэк і балот і ў абодвух выпадках звязваецца з размяшчэннем вышэй за суадносныя з імі аб’екты з падобнымі імёнамі, але без паказчыка *верхні*: р. *Ве́рхняя Зако́ванка* < р. Зако́ванка, балота *Грэ́за Ве́рхняя* < *Грэ́за (такога балота

зараз няма, але ёсць рака). Можна разглядаць такія прыклады як прыватныя выпадкі рэалізацыі кагнітыўнай схемы *верх – ніз*, у якой апошняя пазіцыя не выражана, аднак імпліцытна захоўваецца ў мове. Больш яскрава схема праяўляецца ў назвах населеных пунктаў:

фіксацыя свайго адноснага размяшчэння не толькі ў межах мікрасістэмы двух-трох іменаў, але і праз кропкавае ўказанне на прыналежнасць да іншага аб’екта (14 адз.): вёскі Р*у́дня Антóнаўская, Ру́дня Астравíтая і Ру́дня Гарбавíцкая* арыентуюць адносна адна адной і ў суаднясенні з вв. Антóнаўка, Астравíты і Гарбавíчы;

блізкасць да вытокаў ці да вусця ракі актуалізуе схему *верх – ніз* (6 адз.), дзе верхніх (4 адз.) іменаў адзначана больш, чым ніжніх (2 адз.): *Вéрхні Млынóк, Нíжнія Пагарáны, Вéрхняя Свíслач*;

суб’ектываваная гарызантальная арыентацыя *левы – правы* адносна пазіцыі намінатара (2 адз.), якая размешчана ў горадзе: вёскі *Масты́ Лéвыя, Масты́ Прáвыя*, а прысутны ў топасістэме трэці, прамежкавы, кампанент – г. *Масты́* – з’яўляецца тым месцам, адкуль намінатар ацэньвае размяшчэнне двух недалёкіх ад яго аб’ектаў;

суб’ектываваная вертыкальная арыентацыя *горны – дольны* адносна пазіцыі намінатара (2 адз.): вёскі *Саму́йлавічы Гóрныя, Саму́йлавічы Дóльныя*;

аб’ектываваная арыентацыя *паўднёвы – паўночны* праз кірункі свету (2 адз.): вёскі *Паўднёвае Гняздзілава, Паўнóчнае Гняздзілава*.

Да апошняга з апісаных спосабаў прымыкае адзіны ў дадзенай групе тапонімаў прыклад запазычання: *Ры́та* < літ. Rytų ‘ўсход, усходні’ [2, с. 279]. Ён арыентуе на ўсход, што дапасуецца да яго сапраўднай прасторавай сувязі з в. Літвіны. Рака з такой назвай знаходзіцца на ўсходнім і паўднёва-ўсходнім напрамках ад вёскі.

*Табліца 2*

**Прадстаўленасць схемы «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз рэляцыйнасць» у розных відах аб’ектаў**

| Аб’ект свету | Колькасць, адз. | Доля, % | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Населены пункт і яго часткі | 26 з 2475 | | В. *Кáпліцкі Варaты́н < в. Каплíчы* |
| Вадаём з цякучай вадой і яго часткі | 1 з 215 | | Р. *Вéрхняя Закóванка < р. Закóванка* |
| Вадаём са стаячай вадой і яго часткі | 1 з 1074 | | Б. *Грэ́за Вéрхняя < *р. Грэ́за* |

У табліцы 2 прапанаваны статыстычныя паказчыкі і прыклады розных відаў тапонімаў, у якіх аб’ект арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз рэляцыйныя прыкметы.

Выяўленыя спосабы прадстаўлення дадзенай схемы дазваляюць заўважыць відавочную сістэмнасць у актуалізацыі праз мову адноснасці размяшчэння ў прасторы, аднак невялікая прадстаўленасць самой групы (28 адз., 0,59 %) і спарадычнасць спасылак на назвы з падобнымі кампанентамі сярод імёнаў канструкцыі «2AN» не даюць назваць іх вызначальнымі ў пабудове цэласнай сістэмы тапонімаў Беларусі.

**Схема «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз якаснасць».** Яна дэманструе найбольшую прадуктыўнасць сярод схем, падпарадкаваных канструкцыі «2AN» (85 адз., 1,81 %). Падобныя па назве аб’екты размяжоўваюцца з дапамогай другасных атрыбутаў:

1) памеру (51 адз., 1,08 %): малых аб’ектаў больш (27 адз.: *Мала́я Курні́ца, Малы́я Азёркі*), чым вялікіх (23 адз.: *Вялі́кая Гану́та, Вялі́кі Бо́каў*), ёсць прыклад прамежкавай назвы (*Сярэ́дні Крушнікóўскі*);

2) гісторыі з’яўлення (39 адз., 1,04 %): «новых» аб’ектаў больш (27 адз.: *Новадубава́я, Но́вае Запо́нне*), чым «старых» (12 адз.: *Стары́ Крыўск, Стары́я Клё́нкі*). У межах групы фіксуецца пераход састаўных імёнаў у складаныя, у чым і заключаецца словаўтваральная асаблівасць дадзенай групы (*Нававо́льберавічы, Новазаро́нава, Старадубава́я*);

3) ацэнкі (1 адз., 0,02 %): *Кра́снае Беразіно́*;

4) колеру (1 адз., 0,02 %): *Чо́рная Га́нча.*

У табліцы 3 прапанаваны статыстычныя паказчыкі і прыклады тапонімаў, у якіх аб’ект арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз якаснасць.

*Табліца 3*

**Прадстаўленасць схемы «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз якаснасць» у розных відах аб’ектаў**

| Аб’ект свету | Колькасць, адз. | Доля, % | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Населены пункт і яго часткі | 86 з 2475 | | в. *Малы́я Сітцы < в. Сітцы,* в. *Старадубава́я,* в. *Новадубава́я < *Дубавая* |
| Вадаём з цякучай вадой і яго часткі | 3 з 215 | | Р. *Стара́я Ухлясць < р. Ухлясць* |
| Вадаём са стаячай вадой і яго часткі | 3 з 1074 | | Воз. *Вялі́кае Кама́рына < воз. Кама́рына, б. Но́вы На́хаў < б. На́хаў* |

Захоўваецца пераважная ўцягнутасць населеных пунктаў у працэс другаснага размежавання аб’ектаў. У адрозненне ад канструкцыі «1AN»,

дзе дамінуюць адносныя прыкметы, імёны, якія апавядаюць гэтай схеме, часцей звяртаюцца да ўласных якасцей аб’ектаў.

**Схема «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз парадак аб’ектаў пры лічэнні».** Яна прадстаўляе найбольш аднародную з пункту гледжання сродкаў намінацыі групу імёнаў канструкцыі «2AN» (57 адз., 1,21 %). Індывідуальны статус гэтых тапонімаў рэалізуецца праз лічбавыя паказчыкі (гл. Табліца 4).

*Табліца 4*

**Прадстаўленасць схемы «аб’ект, які арыентуе адносна аднайменнага аб’екта праз парадак аб’ектаў пры лічэнні» ў розных відах аб’ектаў**

| Аб’ект свету | Коль-касць, адз. | Доля, % | Прыклады |
|---|---|---|---|
| Вадаём са стаячай вадой і яго часткі | 25 з 1074 | 2,33 | *Быхаўскае 1, Васілевічы 2, Машчанка 1, Ермакова 2* |
| Населены пункт і яго часткі | 32 з 2475 | 1,29 | *Бяро́заўка 1, Вецярэ́вічы 2, Чарні́чка 3, Чарні́чка 4* |

Схема характарызуе назвы балот і населеных пунктаў. Прадуктыўнасць атрыбутаў наступная: «1» – 29, «2» – 25, «3» – 1, «4» – 1, «5» – 1 прыклад.

Такім чынам, канструкцыя «2AN» ужываецца пры звужэнні гарызонту погляду суб’екта да некалькіх аб’ектаў аднаго віду, размешчаных у невялікай прасторы. Індывідуальная характарыстыка рэаліі высвечваецца на фоне групы рэферэнтаў, якія ўспрымаюцца як часткі калісьці цэлага аб’екта. Прадуктыўнай для другасных атрыбутаў становіцца арыентацыя праз спасылку на якаснасць, хоць сама сутнасць канструкцыі зводзіцца да дэманстрацыі менавіта рэляцыйных, звязаных з адноснасцю арыентацыі характарыстык аб’ектаў. Такія імёны фіксуюцца толькі для сярэдніх па велічыні вёсак і вадаёмаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Leino A.* Place-Names as Constructions // Cognitive Onomastics: a Reader / ed. by S. Brendler. Hamburg : Baar, 2016.

2. *Vanagas A.* Lietuvių hidronimų etimologinis žodynas. Vilnius : Mokslas, 1981.